**Водгук**

**на аўтарэферат дысертацыі А. М. Сінілы**

**«Сюжэтна-тэматычныя асаблівасці жывапісу з даваенных калекцый музеяў Мінска»**

на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства

па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

Дысертацыя суіскальніка А. М. Сінілы з'яўляецца першым комплексным даследаваннем сюжэтна-тэматычных асаблівасцей твораў жывапісу са збораў Мінскага сацыяльна-гістарычнага музея і Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР. Унікальнасць гэтых калекцый заключалася ў багацці жывапісу, прадстаўленага рознымі перыядамі, школамі і краінамі. На жаль, у Вялікую Айчынную вайну згаданыя зборы былі разрабаваны і знішчаны. Гэта прывяло да таго, што многія творы зніклі з кантэксту беларускага мастацтвазнаўства на доўгі час. Існавала меркаванне, што страта карцін не дазваляе меркаваць пра асаблівасці жывапісу мінскіх музеяў, якое абвяргаюць вынікі праведзенага даследавання.

Суіскальнік, выкарыстоўваючы розныя метады даследавання і аналізуючы вялікую колькасць раней невядомых дакументаў, змог паспяхова вырашыць пастаўленыя задачы, не толькі вызначыць сюжэты, жанры, але і атрыбутаваць больш за 100 жывапісных твораў з даваенных калекцый. Шэраг карцін, якія лічыліся загінуўшымі, былі наноў уведзены даследчыкам у шырокі зварот. Праца вызначаецца багаццем сабранага матэрыяла і ўменнем яго аналізаваць.

Даследаванне мае вялікае практычнае значэнне. Ужо пасля публікацый некаторых навуковых артыкулаў па тэме дысертацыі, інфармацыя з іх была выкарыстана ў экспазіцыйнай і выставачнай дзейнасці шэрагу буйных музеяў Беларусі, у тым ліку Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь.

Аўтарэферат і дысертацыя А. М. Сінілы афармлены ў адпаведнасці з патрабаваннямі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь і мы лічым, што суіскальнік заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства.

Выказваем згоду на размяшчэнне водгука на сайце ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі».

20.05.2026

Трыфанава Наталья Якаўлеўна
кандыдат мастацтвазнаўства,
вядучы навуковы супрацоўнік
Нацыянальнага мастацкага музея
Рэспублікі Беларусь